ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

● НЕ ЗГАСНЕ ПОДЗВІГ КАМУНАРАЎ ● **БУДНІ ДРУГОГА СЕМЕСТРА.** ● ЛЕНІНСКІ ЗАЛІК—ЭКЗАМЕН КАМСАМОЛЬЦАЎ ● **ПЛЁН НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ** ● ДА 23-ГОДДЗЯ САВЕЦКА-БАЛГАРСКАГА ДАГАВОРУ ● **ВЯСЕННІЯ КЛОПАТЫ**

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 10 (805) ● Чацвер, 18 сакавіка 1971 г. Цана 2 кап. ● Год выдання XXIV

ВЯЛІКІ ПАЧЫН ГЕРОЯЎ КАМУНЫ

Бываюць падзеі, якія пры ўсёй сваёй кароткачасовасці пакідаюць глыбокі след у развіцці грамадства, бо ў іх, няхай яшчэ ў зародку, праяўляюцца новыя, усё перамагаючыя гістарычныя тэндэнцыі. Да ліку такіх падзей адносіцца Парыжская Камуна 1871 года, праіснаваўшая ўсяго 72 дні ў межах аднаго горада. «Парыж рабочых,—прадбачліва пісаў тады Маркс,— заўсёды будуць шанаваць, як слаўнага папярэдніка новага грамадства».

Цяпер, праз сто год, у святле перамен, якія адбыліся за гэты час на зямным шары, асабліва яскрава і важка выступае веліч справы парыжскіх камунараў і геніяльнасць марксава прадбачання.

Камуна была першым у гісторыі «ўрадам рабочага класа». У ёй знайшло пацвярджэнне жыццёвай практыкай класавай барацьбы вучэнне Маркса і Энгельса аб дыктатуры пралетарыяту, і тым быў нанесен рашучы ўдар па дагматычных прынцыпах дамарксава сацыялізма. «Просты рабочы народ зразумеў, што яму неабходна перш за ўсё авалодаць кіруючай уладай, калі ён хоча дабіцца хоць якога-небудзь выніку. Варта толькі было варухнуцца рабочым прадмесцям, каб рассеяць у прах усе дылетанцкія разумнічанні Прудона, якімі ён на працяту 20 год думаў убаюкваць народ»,—пісаў французскі сацыяліст Поль Луі.

Камуна, узнікшая ў выніку перамогі парыжскіх пралетарыяў у рэвалюцыйным паўстанні 18 сакавіка 1871 года, склалася не як орган самакіравання Парыжа, а як агульнадзяржаўная ўлада, якая супрацьставіла сябе контррэвалюцыйнаму ўраду Т'ера, што акапаўся ў Версалі. Першым дэкрэтам яе быў дэкрэт аб несумяшчальнасці мандата дэпутата Камуны з мандатам члена Нацыянальнага сходу. Разам з рабочымі вакол Камуны згуртавалася дробнабуржуазная дэмакратыя і лепшая частка інтэлігенцыі. Тут былі Віктар Гюго, мастак Курбе, кампазітар Сальвадор і многія іншыя. «Упершыню ў гісторыі дробная і сярэдняя буржуазія адкрыта аб'ядналася вакол рабочай рэвалюцыі і абвясціла яе адзіным сродкам уласнага выратавання і выратавання Францыі». (К. Маркс).

Заваяваўшы ўладу, пралетарыят Парыжа пачаў з ломкі старой дзяржаўнай машыны і адначасовага стварэння новага дзяржаўнага апарату, здольнага забяспечыць здзяйсненне інтарэсаў народных мас. Была знішчана пастаянная армія і заменена усеагульным узбраеннем народа ў выглядзе Нацыянальнай гвардыі, ліквідавана паліцыя і жандармерыя. У барацьбе з сабатажам чыноўнікаў быў нанесен сакрушальны ўдар бюракратычнай чыноўніцкай касце устанаўленнем выбарнасці і змяняемасці ўсіх чыноўнікаў, іх адказнасці перад народам. Быў скасаван бюджэт культаў, і царква аддзялілася ад дзяржавы. Жанчыны ўраўняліся ў палітычных і эканамічных правах з мужчынамі. Да кіраўніцтва ўстановамі, створанымі Камунай, выдзяляліся новыя людзі, цесна звязаныя з пралетарскім асяроддзем.

Сама Камуна насіла зусім іншы характар, чым звычайныя буржуазныя парламенты. Розніца заключалася перш за ўсё ў тым, што дэпутаты Камуны трымалі адказнасць перад народам, маглі быць у любы момант адазваны выбаршчыкамі. Гэта забяспечвала іх арганічную сувязь з народам. Камуна была актыўна дзейнічаючым органам, у якім злучалася заканадаўчая і выканаўчая ўлада. Яна не толькі выдавала законы, але і сама непасрэдна кіравала ўсімі галінамі кіравання і выкананнем законаў. У. І. Ленін указваў з гэтай прычыны: «Прадстаўнічыя ўстановы застаюцца, аднак парламентарызму, як асобай сістэмы, як раздзялення працы заканадаўчай і выканаўчай, як прывілеяванага становішча для дэпутатаў, тут няма».

Ва ўсёй сваёй дзейнасці Камуна абапіралася на масавыя рэвалюцыйныя арганізацыі пралетарыяту Парыжа. Самай распаўсюджанай формай такіх арганізацый былі тады палітычныя клубы, якія засядалі ў памяшканнях цэркваў або грамадзянскіх устаноў і аб'ядноўвалі вакол сябе па некалькі тысяч чалавек. Сярод іх самымі папулярнымі былі Камунальны клуб і Клуб сацыяльнай рэвалюцыі. У клубах абмяркоўваліся сацыяльныя праблемы, пытанні ўзброенай барацьбы з контррэвалюцыяй. Тут прапагандаваліся або крытыкаваліся рашэнні Каму-

(Заканчэнне на 2-й стар.).

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

ПРАЦАВАЦЬ АКТЫЎНА, ТВОРЧА

Праект Дырэктыў па новаму пяцігадоваму плану горача адобрылі на сваім сходзе камуністы адміністрацыйна-гаспадарчай часткі БДУ. Выступаючы ў спрэчках па дакладу прарэктара І. А. Ажыгіна, член партыйнага бюро М. Т. Навуменка падкрэсліў клопаты Камуністычнай партыі аб умацаванні эканамічнай магутнасці нашай краіны, павышэнні матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця савецкіх людзей.

Гаворачы аб вынікаў мінулай пяцігодкі, тав. Навуменка праілюстраваў іх красамоўнымі лічбамі і заклікаў прысутных па-баявому, энергічна брацца за выкананне новых задач, намечаных у праекце Дырэктыў і вылучаных XXVII з'ездам Камуністычнай партыі Беларусі.

Галоўны бухгалтар БДУ Э. І. Бяляўскі расказаў аб тым, як узрасла матэрыяльна-тэхнічная база універсітэта ў мінулай пяцігодцы. Кошт асноўных сродкаў павялічыўся на 7023,3 тыс. рублёў. Уведзены ў эксплуатацыю вучэбныя карпусы фізічнага і хімічнага факультэтаў, інтэрната № 6 агульным коштам 4264,6 тыс. рублёў.

Значныя сродкі ўкладзены ў новае будаўніцтва. У сёлетнім годзе плануецца ўвод у эксплуатацыю студэнцкага інтэрната на 1220 месц па вуліцы Кастрычніцкай, корпуса біястанцыі ў Шчомысліцы і 108-кватэрнага жылога дома Мінвуза БССР па вуліцы Даумана. Пачалося будаўніцтва корпуса інстытута фізікі ў Шчомысліцы, праектуецца жылы дом БДУ у раёне вуліцы Харкаўскай.

Аб тым, як адклікнуліся на праект Дырэктыў бібліятэчныя работнікі, расказала дырэктар універсітэцкай бібліятэкі І. У. Арэхоўская. Сваю задачу яны бачаць у тым, каб узорна абслугоўваць чытачоў, высакаякасна весці даведніцка-бібліяграфічную і інфармацыйную работу, на высокім узроўні праводзіць масавыя мерапрыемствы.

Прыемна адзначыць, што свае перадз'ездаўскія абавязацельствы гэты калектыў выканаў поўнасцю і датэрмінова, 3 сакавіка. І ў гэтым вялікая заслуга партыйнай арганізацыі.

З адабрэннем праекта Дырэктыў і канкрэтнымі прапановамі аб тым, як павысіць эфектыўнасць працы і такім чынам актыўна ўдзельнічаць у выкананні задач новай пяцігодкі, выступілі Г. А. Мужычэнка, М. Я. Пракапенка, У. П. Цурко.

Е. ІВАНЮЦЕНКА.

ПАЗНАННІ ПРАЗ ВОПЫТ

Здаецца, зімовая сесія яшчэ не сцерлася ў памяці, а вясеннія выпрабаванні ўжо ля парога. Палова другога семестра занатавана ў канспектах. На практычных занятках замацоўваецца пройдзены матэрыял.

У лабараторыі біялагічнага факультэта напружаная цішыня. Толькі зрэдку чуюцца галасы студэнтаў: вырашаюцца спрэчныя пытанні, або чуецца цвярджальны голас асістэнта кафедры фізічнай хіміі Міхаіла Львовіча Калістратава. Тут праходзяць практычныя заняткі па калоіднай хіміі. Студэнткі 4-й групы II курса працуюць папарна. Усім раздадзены заданні: патрэбна правільна рашыць вопыт тэарэтычна і даказаць яго практычна. Выкананне такіх задач патрабуе цвёрдых ведаў, уважлівасці і акуратнасці. На сталах многа колб рознай велічыні, штатывы з замацаванымі бюрэткамі, злучальныя трубкі, мензуркі, хімічныя шклянкі і мноства вымяральных прыбораў. Усё гэта можа саслужыць добрую службу ў руках дасведчанага чалавека.



Ля аднаго са столікаў працуюць дзве дзяўчыны, абедзве Олі, Зуйневіч і Ленкавец (на здымку ўнізе). Іх вопыт называецца, здавалася б, проста—крыаскапія, але за гэтым словам крыецца немалая праца. Ім неабходна вызначыць паніжэнне тэмпературы замярзання раствору. Дзяўчаты раз-пораз дабаўляюць у шклянку снег, змешваюць з вадой і неадрыўна сочаць за ртутным слупком тэрмометра. У прабірцы з растворам паступова ўтвараюцца крышталікі лёду.

Ля другога століка над канспектам схіліліся Галіна Шаўлак і Ірына Балтрамовіч. На іх рабочым месцы стаіць некалькі прабірак з растворамі рознай канцэнтрацыі. Іх вопыт мае прамыя адносіны да вытворчасці. Такім спосабам робяць аналіз растворaў. Пры дапамозе прыбора нефелометра дзяўчаты пазнаюць аптычныя ўласцівасці калоідных сістэм.

Вось за столік да выкладчыка садзіцца Марыя Бас. Разам з Марыяй Варава яны рабілі вопыт кандуктаметрычнага тытравання. Вопыт атрымаўся, на тэарэтычнае пытанне Марыя Бас адказала добра. Правілы Шульца-Гардзі расказвала Валя Голас. Адказ дастаткова поўны. Усё ў парадку. Да здачы работ рыхтуюцца іншыя дзяўчаты. Ля колб і прабірак увіхаюцца Люда Кацуба, Наташа Аўгуль, Галя Шаўлак.

І. КАШАРОЎСКІ.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

24 сакавіка а 16-й гадзіне ў кіназале геаграфічнага корпуса адбудуцца чарговыя заняткі кіруючых работнікаў і актывістаў грамадскіх арганізацый універсітэта. З лекцыяй «Навуковая арганізацыя ўпраўленчай працы» выступіць кандыдат эканамічных навук дацэнт С. І. Лукашэвіч.

РЭКТАРАТ ПАРТКОМ МЯСЦКОМ ПРАФКОМ
КАМІТЭТ КАМСАМОЛА

ВЯЛІКІ ПАЧЫН ГЕРОЯЎ КАМУНЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

ны, выстаўляліся патрабаванні больш рашучых мер. Рэвалюцыя абудзіла невычэрпныя творчыя сілы, якія таіліся ў народзе, і прывяла іх у дзеянне.

Зробленае ў сацыяльна - эканамічнай галіне яскрава характарызуе Камуну як урад рабочага класа, які імкнуўся забяспечыць кроўныя інтарэсы народа і на гэтым шляху адшукваў сродкі сацыялістычнага пераўтварэння грамадства. Упершыню ў гісторыі на прадпрыемствах Парыжа, пакінутых іх уладальнікамі, што ўцяклі са сталіцы, дэкрэтам Камуны рабочым адводзілася роля арганізатараў і кіраўнікоў вытворчасці. На прадпрыемствах асобага дзяржаўнага значэння ўстанаўліваўся рабочы кантроль. Былі палепшаны ўмовы работы і жыцця працоўных: забаронены штрафы і адлічэнні з зарплаты, начныя работы ў булачных, дадзены льготы ў выплаце запазычанасці па кватэрплаце, тысячы беднякоў пераселены з падвалаў ў пустуючыя кватэры буржуазіі.

К. Маркс захапляўся рэвалюцыйна - гістарычнай ініцыятывай французскіх пралетарыяў, стыхійна, не маючы вопыту, ствараючых пралетарскую дзяржаву. Ён прынёс на службу Камуны, як яе практычны дарадчык, як арганізатар выступленняў Першага Інтэрнацыянала ў карысць Камуны, увесь свой талент і аўтарытэт рэвалюцыйнага правадыра.

Усе свае пераўтварэнні Парыжскай Камуне давялося здзяйсняць адначасова з узброенай барацьбой супраць версальскіх войск. Гісторыя адвяла Камуне толькі два тыдні мірнай перадышкі. Каля сцен Парыжа стаяла ўзброеная да зубоў германская армія, аднак галоўнае было нават не ў гэтым. Камуна ўзнікла ў эпоху, калі французскі капіталізм быў яшчэ недастаткова развіты, калі пралетарыят быў яшчэ слабы, калі яму не хапала рэвалюцыйнай партыі, здольнай узначаліць яго барацьбу. Адсюль вынікалі слабасці і памылкі Камуны, галоўная з якіх была ў тым, што Камуна не давяла да канца «экспрапрыяцыю экспрапрыятараў», у прыватнасці, не завалодала каштоўнасцямі Французскага банка, які, па словах Ф. Энгельса, азначаў бы ў руках Камуны больш чым 10 тысяч заложнікаў.

Сур'ёзнейшай палітычнай памылкай была боязь узяць на сябе ініцыятыву ў развязванні грамадзянскай вайны, стаўшай у той момант зусім непазбежнай. Замест таго, каб адразу ж накіраваць сілы ўзброенага народа на Версаль, дзе акапаўся контррэвалюцыйны ўрад Т'ера, Камуна марудзіла і дала магчымасць Т'еру выйграць час, накапіць сілы для штурму Парыжа. Камуне не ўдалося ва ўмовах асаджанага горада дабіцца цеснай сувязі з сялянствам, хоць яна і рабіла захады ў гэтым напрамку.

Камуна садзейнічала развіццю і ўмацаванню ў рабочым руху свядомасці пралетарскага інтэрнацыяналізму, якім была пранізана ўся яе дзейнасць. На яе барыкадах змагаліся прадстаўнікі многіх нацыянальнасцей, у яе дэкларацыях гучаў лозунг «сусветнай рэспублікі».

Калі 28 мая 1871 года пала апошняя барыкада Камуны і азвярэўшая рэакцыя затапіла Парыж у патоку крыві, Т'ер саманадзейна заявіў, што з сацыялізмам пакончана назаўсёды. Але гісторыя любіць жартаваць з ворагамі прагрэсу. Прайшло менш паўвека, і Вялікая Кастрычніцкая рэвалюцыя прадоўжыла справу Камуны ў іншых, гіганцкі непамерных маштабах. Саветы з'явіліся развіццём і завяршэннем той дзяржаўнай формы, зародкам якой была Камуна. Толькі тры дзесяцігоддзі патрабаваліся затым, каб сацыялізм склаўся ў сусветную сістэму.

Іншыя, у многа разоў больш грандыёзныя гістарычныя падзеі, нібы хавалі ў цень кароткачасовую перамогу парыжскіх пралетарыяў. Вопыт Камуны растварыўся ў шматгранным вопыце краін сацыялістычнага рабочага руху. Але ад гэтага не пацьмянела, а, наадварот, у вялікай ступені выйграла гістарычнае значэнне вялікага пачыну рабочых Парыжа.

Л. ШНЕЕРСОН,
прафесар.

Камсамольскае жыццё

ЯК ДА АДКАЗНАГА ЭКЗАМЕНА...

А САБЛІВАЕ месца ў выхаваўчай рабоце сярод моладзі займае цяпер Ленінскі залік, які праводзіцца пад дэвізам «Мы справе Леніна і партыі верныя!»

Яго правядзенне спачатку здавалася многім вельмі простай справай: вывучаеш некалькі твораў У. І. Леніна, выконваеш грамадскае даручэнне, паспяваеш у вучобе — атрымлівай залік! Так думалі і на геаграфічным факультэце. У камітэце камсамола вырашылі не ўмешвацца ў асабістыя справы студэнтаў, бо кожны з іх сам за сябе адкажа. Але гэта было толькі спачатку. У хуткім часе тут зразумелі, што Ленінскі залік—не фармальнасць, а цэлы комплекс арганізацыйна - тэхнічных мерапрыемстваў, своеасаблівая адказнасць кожнага камсамольца перад партыяй, народам, сваімі сябрамі за асабісты ўклад у справу будаўніцтва камунізма, за свой грамадска-палітычны рост.

Сакратар камсамольскай арганізацыі геафака Віктар Раманаў на чарговым пасяджэнні, як кажуць, паставіў пытанне рубам: «Што нас чакае: Ленінскі залік ці фармальны экзамен?» Спрэчак і прапаноў было многа. У выніку гэтага работа па падрыхтоўцы да Ленінскага заліку «пайшла». Перш за ўсё былі прагледжаны ўсе сацыялістычныя абавязацельствы камсамольцаў. Вырашылі весці праверку іх выканання на працягу ўсяго навучальнага года, а не тады, калі залік ужо надыходзіць. Гэта значна аблегчыла справу. Намецілі шэраг канкрэтных мерапрыемстваў. Так, разам з партыйнай арганізацыяй факультэта было запланавана правесці своеасаблівы ленінскі ўрок па вывучэнню праекта Дырэктыў XXIV з'езда КПСС, матэрыялаў XXVII з'езда КПБ і твораў У. І. Леніна, якія не ўключаны ў вучэбную праграму.

Вялікую ролю ў выхаванні камсамольца адыгрываюць сустрэчы з ветэранамі партыі, экскурсіі па ленінскіх мясцінах, тэматычныя выстаўкі аб жыцці і дзейнасці правадыра. Разам са студэнтамі біялагічнага факультэта географы слухалі расказ камсамольца 20-х гадоў, удзельніка III з'езда РКСМ Яўгена Сцяпанавіча Балакіна, які расказаў пра гераічнае мінулае маладой Краіны Саветаў, пра будаўніцтва новага ладу, выкананне запаветаў Ільіча.

Хочацца ўспомніць аб добрым пачыне на факультэце ў групах першага курса камсамольскіх куратараў. Студэнты IV або V курсаў бяруць своеасаблівае шэфства над навічкамі, дапамагаюць ім разабрацца ва ўсіх складанасцях у жыцці вну і адначасова разам з кураторамі дэканата кантралююць іх вучобу і грамадскую дзейнасць. Гэты кантроль дазваляе камітэту камсамола ў любы момант даведацца аб справах у кожнай камсамольскай групе, бо вядома, што арганізацыйнымі цэнтрамі ўсёй работы, звязанай з правядзеннем Ленінскага заліку, з'яўляецца іменна камсамольская група.

Мне давялося прысутнічаць на ленінскім уроку студэнтаў I групы I курса. Тут абмяркоўвалі праект Дырэктыў XXIV з'езда КПСС па пяцігадоваму плану развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1971—1975 гады. Кожны камсамолец сур'ёзна аднёсся да гэтай важнай справы.

В. Раманаў заўважыў: «Мэта і змест ленінскага ўрока не ў разжоўванні тых або іншых тэарэтычных палажэнняў, а ў тым, каб навучыць студэнтаў думаць самастойна.

І сапраўды, яго словы пацвярджаліся канкрэтным прыкладам. Вельмі бойка і ўпэўнена пачала свой расказ пра развіццё прамысловасці ў гэтай пяцігодцы Тамара Асадчая. Адчуваецца, што рыхтавалася яна вельмі добрасумленна. Ёй хацелася данесці да сваіх сяброў усё тое, што намечана партыяй выканаць у 1971—1975 гг.

Аб развіцці аўтаматыкі і кібернетыкі, аб тым, што плануецца зрабіць у гэтым напрамку, расказаў прысутным Федзя Вальковіч.

Кожны выступаючы неяк па-асабліваму расказваў пра будучае, блізкае будучае, у якім давядзецца кожнаму з нас жыць і працаваць.

Можна было ўбачыць задаволеныя ўсмешкі на тварах куратара групы В. В. Шчыгловай і прадстаўніка партыйнай арганізацыі геафака В. П. Барадзіной. Так, яны былі задаволены тым, што камсамольцы па-сапраўднаму адносяцца да вывучэння важнейшых дакументаў, правільна іх разумеюць. А ў гэтым немалая заслуга камітэта камсамола.

У камітэце камсамола мне сказалі, што Ленінскі залік на геафаку будзе праведзен у канцы сакавіка—пачатку красавіка. Ужо складаюцца графікі, абмяркоўваюцца арганізацыйныя пытанні ў камісіі па прыёму заліку. Падрыхтоўка ідзе, як да адказнага экзамена.

Тут жа я пачуў і такое: «Нам не пагражае лёс таго студэнта, які, здаўшы экзамен, адразу ж забывае вывучаную навуку. Пасля Ленінскага заліку мы будзем яшчэ больш моцнымі, узброенымі новымі ведамі і перакананымі ў сваіх сілах».

Ёсць усе падставы меркаваць, што так яно і будзе.

Ул. СКУЛЬБЕДАЎ,
наш кар.

ПЕРАМОЖЦЫ РЭСПУБЛІКАНСКАГА АГЛЯДУ

У ленінскім юбілейным годзе навуковая работа студэнтаў атрымала далейшае развіццё. Гэта пацвердзіў агляд навуковых студэнцкіх прац вну Беларускай ССР па прыродазнаўчых і тэхнічных навуках, праведзены ў 1970-71 навучальным годзе. У аглядзе прынялі ўдзел 25 вну рэспублікі. Усяго было прадстаўлена 1.713 работ, значна больш, чым у папярэднім годзе. Павысілася тэарэтычны ўзровень і практычная каштоўнасць даследаванняў, выкананых студэнтамі. 25 працэнтаў з агульнай колькасці работ аднесены да I катэгорыі.

Кафедры і саветы студэнцкіх навуковых таварыстваў БДУ рэкамендавалі на рэспубліканскі агляд 309 работ. Аб высокім узроўні і вартасці прац студэнтаў універсітэта гаворыць той факт, што 102 работы аднесены да I катэгорыі, 150 — да II і толькі 50—да III катэгорыі. Пастановай калегіі МВ і ССА БССР і Бюро ЦК ЛКСМБ за дасягненне высокіх паказчыкаў на рэспубліканскім аглядзе наш універсітэт узнагароджан Ганаровай граматай Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР і ЦК ЛКСМБ.

Самым лепшым работам прысуджаны першыя, другія і трэція месцы, а іх аўтары ўзнагароджаны граматамі міністэрства і грашовымі прэміямі ў размеры 50, 35 і 25 рублёў.

Першае месца прысуджана **М. Нікановічу,** студэнту фізічнага факультэта, за работу «Уплыў дэйтэрыравання на спектральна-люмінесцэнтныя ўласцівасці гідратаў ураніл-нітрату»; навуковы кіраўнік — малодшы навуковы супрацоўнік **Г. Г. Навіцкі.**

Другія месцы прысуджаны:

Ф. Моусін, В. Пелагеінай, студэнтам хімічнага факультэта, за работу «Даследаванне прадуктаў узаемадзеяння паміж селенідам серабра і ёдыдам ртуці, селенідам серабра і брамідам ртуці»; навуковы кіраўнік—кандыдат хімічных навук **Т. П. Каратаева.**

А. Кілбасу, студэнту матфака, за работу «Метад апраксімацыі для пабудовы тэорыі асобных інтэгральных ураўненняў»; навуковы кіраўнік — акадэмік АН БССР **Ф. Д. Гахаў.**

В. Быкоўскаму, студэнту фізфака, за работу «Уплыў медзі на электрычныя ўласцівасці арсеніду галію»; навуковы кіраўнік — ст. выкладчык **Д. С. Даманеўскі.**

В. Цітаруку, студэнту гістфака, за работу «Франкаруская дыпламатычная барацьба перад вайной 1812 года»; навуковы кіраўнік — прафесар **М. П. Палетыка.**

С. Крэпскаму, студэнту філфака, за работу «Этымалогія назваў грыбоў у гаворках Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці»; навуковы кіраўнік — дацэнт **Я. М. Камароўскі.**

Трэція месцы прысуджаны:

В. Марчанка (матфак) за работу «Праследаванне з захватам і задача бегства з незахватам для выпадку нелінейнай дыскрэтнай ігры»; навуковы кіраўнік — прафесар **Р. Ф. Габасаў.**

Т. Кузняцовай, студэнтцы хімфака, за работу «Даследаванне працэсаў абязводжвання некаторых вытворных цэлюлозы»; навуковы кіраўнік — ст. выкладчык **Е. М. Барысенка.**

К. Артамонавай, студэнтцы геафака, за работу «Асноўныя тыпы рэльефу Верхаянскай горнай сістэмы на буйнамаштабных тапаграфічных картах»; навуковы кіраўнік — прафесар **В. Р. Заўрыеў.**

(Працяг будзе).

НА ЗДЫМКАХ: ідзе спецсемінар «Асаблівасці сучаснага капіталістычнага цыклу» на трэцім курсе аддзялення палітэканоміі гістарычнага факультэта. Праводзіць яго дацэнт У. П. ВАСІН. Выступае Леанід БУРДЫНАЎ.

Фота *Д. Чаховіча.*



У ГАСЦЯХ У СТАНКА-БУДАЎНІКОЎ

На заводзе імя Кастрычніцкай рэвалюцыі адбылася сустрэча камсамольцаў заводакіраўніцтва з пачынаючымі паэтамі-студэнтамі факультэта журналістыкі нашага універсітэта. Першым выступіў член бюро літаб'яднання «Крыніцы» пры газеце «Чырвоная змена» студэнт журфака Валерый Шыханцоў. Ён расказаў прысутным аб слаўным шляху, пройдзеным «Чырвонай зменай» за 50 год існавання, аб тым, што амаль усе вядомыя зараз беларускія паэты і празаікі пачыналі друкавацца ў «Чырвонцы».

Потым перад прысутнымі выступілі студэнты факультэта журналістыкі Леанід Аноп, Алесь Гаўрон, супрацоўнік мінскай раённай газеты «Шлях камунізма» Таццяна Дзмітрусёва. Яны расказалі пра свой шлях у краіну Паэзіі, прачыталі новыя вершы.

Загадчыца заводскай бібліятэкі Люба Зайкова ад імя прысутных падзякавала маладым паэтам за іх выступленні.

У. ЯГОРАЎ.

Савецка-балгарскаму Дагавору—23 гады

18 сакавіка 1948 года ў Маскве быў падпісан Дагавор аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе паміж Савецкім Саюзам і Народнай Рэспублікай Балгарыяй. Дагавор адкрыў новую старонку ў адносінах паміж краінамі, стварыў трывалую аснову сапраўднага братэрства і ўзаемаразумення, стаў важным фактарам умацавання незалежнасці краіны, забяспечыўшы хуткае развіццё яе па сацыялістычнаму шляху.

Дагавор вытрымаў выпрабаванне часам. На працягу двух дзесяцігоддзяў брацкія сувязі раслі, мацнелі і пашыраліся. Накоплены вопыт знайшоў сваё адлюстраванне ў новым, падпісаным у Сафіі 12 мая 1967 года савецка-балгарскім Дагаворы. З кожным годам супрацоўніцтва нашых краін становіцца ўсё больш глыбокім і плённым.



МАЦНЕЮЦЬ НАШЫ СУВЯЗІ

Вялікая брацкая дружба яднае калектывы нашага універсітэта і Сафійскага універсітэта імя Клімента Ахрыдскага.

У маі 1970 года быў падпісан пратакол аб праграме супрацоўніцтва нашых універсітэтаў на 1970—1971 гады. Адпаведна з гэтым пратаколам у 1970 годзе для чытання лекцый і абмену вопытам у Сафійскі універсітэт выязджалі доктар філалагічных навук прафесар М. Р. Ларчанка і кандыдат фізіка-матэматычных навук дацэнт В. М. Ламака.

Прафесар М. Р. Ларчанка выступіў перад студэнтамі і выкладчыкамі Сафійскага універсітэта з лекцыямі «Аб балгарска-беларускай літаратурнай узаемасувязі» і «Праблема традыцый і наватарства ў савецкай паэзіі ў святле ленінскага вучэння аб культурнай спадчыне». Дацэнт В. М. Ламака прачытаў чатыры лекцыі для супрацоўнікаў кафедры фізікі паўправаднікоў і праблемнай лабараторыі.

У Сафійскім універсітэце пабывалі загадчык кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў, доктар філасофскіх навук прафесар Ус. М. Сікорскі, загадчык кафедры фізічнай геаграфіі, доктар геаграфічных навук прафесар В. Р. Заўрыеў. Яны пазнаёміліся з работай блізкіх кафедр, прачыталі шэраг лекцый для студэнтаў і супрацоўнікаў. Была дасягнута дагаворанасць аб падрыхтоўцы раду сумесных навуковых работ.

Дацэнт В. М. Цімафеева, якая ўдзельнічала ў семінары рускай мовы ў Сафіі, выступіла па балгарскаму радыё з гутаркай «Балгарская літаратура і балгарская мова ў Беларусі». Дацэнт А. А. Галаўко быў госцем юрысконсультаў Талбухінскай акругі і прачытаў там даклад «Праблемы сацыялістычнай законнасці ў народнай гаспадарцы».

Член-карэспандэнт АН БССР І. М. Лушчыцкі, дацэнт С. Д. Лапцёнак і прафесар Н. Г. Юркевіч прынялі ўдзел у VII Усветным кангрэсе сацыёлагаў, які адбыўся ў балгарскім горадзе Варне.

У сваю чаргу балгарскія вучоныя былі ўдзельнікамі XIV Міжнароднай канферэнцыі эканамістаў-аграрнікаў, якая праходзіла ў БДУ ў жніўні 1970 года. Дацэнт Сафійскага універсітэта М. Леанідава і навуковы супрацоўнік Балгарскай Акадэміі навук М. Младзенаў прысутнічалі і выступілі на сімпозіуме славістаў.

Варта адзначыць, што балгарская тэматыка з'яўляецца прадметам навуковага інтарэсу многіх выкладчыкаў гістарычнага, філалагічнага, геаграфічнага, юрыдычнага факультэтаў, грамадскіх кафедр БДУ.

Прафесары В. Р. Заўрыеў і М. Т. Раманоўскі сумесна з балгарскімі вучонымі І. Івановым і В. Велевым падрыхтавалі да друку географа-эканамічны агляд аб Балгарыі. У Сафіі гэты калектыў апублікаваў кнігу аб Беларусі.

У Беларускай Савецкай Энцыклапедыі ёсць вялікі артыкул аб Балгарыі. Аўтар эканамічнага нарыса—прафесар М. Т. Раманоўскі, а гістарычнага — дацэнт Д. Б. Мельцар. Дацэнт А. А. Галаўко апублікаваў у часопісе «Полымя» рэцэнзію на кнігу «Узнікненне і развіццё кааператыўнага земляробства ў Балгарыі». Кандыдат філалагічных навук В. А. Карпаў з'яўляецца аўтарам артыкула «Імянныя беспрыназоўнікавыя словазлучэнні ў балгарскай мове». Аспірант кафедры зарубежнай літаратуры У. І. Ганчароў працуе над кандыдацкай дысертацыяй на тэму «Загарчынаў і балгарскі гістарычны раман».

Вялікую работу па папулярызацыі балгарскай літаратуры ў Беларусі праводзіць дацэнт універсітэта кавалер ордэна Кірылы і Мяфодзія Н. С. Гілевіч.

У мінулым годзе выйшла з друку кніга вершаў вядомага балгарскага паэта Івана Давыдкава ў яго перакладзе. Ім апублікавана некалькі падборак перакладаў твораў сучасных балгарскіх паэтаў у рэспубліканскім перыядычным друку.

Многія работы вучоных БДУ апублікаваны ў Народнай Рэспубліцы Балгарыі. Так, прафесар М. Р. Ларчанка выступіў у газеце «Литературен фронт» з артыкулам «Балгара-беларускія літаратурныя ўзаемаадносіны», прафесар Л. І. Філоўская — у часопісе «Език и литература» з артыкулам «Максім Горкі і Якуб Колас».

Добрай формай супрацоўніцтва стаў абмен студэнтамі - практыкантамі. Як і ў мінулыя гады, у 1970 годзе дзве групы студэнтаў-філолагаў і геаграфаў праходзілі практыку ў Сафійскім універсітэце, а балгарскія студэнты-хімікі — у нашым універсітэце. Цяпер на факультэце прыкладной матэматыкі вучацца дзве студэнткі з НРБ.

Значны ўклад у развіццё сувязей з балгарскімі сябрамі ўносіць адзяленне таварыства савецка-балгарскай дружбы (ТСБД). У мінулым годзе яно вяло работу так, каб лепш азнаёміць калектыў універсітэта з дасягненнямі НРБ у развіцці эканомікі, навукі і культуры. Ва універсітэце шырока адзначана 22-я гадавіна падпісання Дагавору аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе паміж СССР і НРБ. На факультэтах і ў групах былі праведзены гутаркі і лекцыі аб брацкай дружбе і супрацоўніцтве савецкага і балгарскага народаў. Ва універсітэцкай бібліятэцы к гэтаму дню адкрылася вялікая кніжная выстаўка.

Напярэдадні Дня балгарскай культуры, асветы і славянскай пісьменнасці, 21 мая 1970 года, ва універсітэце адбыўся вечар, прысвечаны гэтай знамянальнай даце.

Да юбілейнай даты сумесна з універсітэцкай бібліятэкай былі падрыхтаваны выстаўкі. Вялікая кніжная выстаўка расказала аб культуры брацкай Балгарыі, культурных узаемасувязях рускага, беларускага і балгарскага народаў. Другая выстаўка дэманстравала кнігі і перыядычныя выданні, атрыманыя універсітэтам з НРБ. Трэцяя — фотавыстаўка — ілюстравала дасягненні балгарскага народа ў галіне асветы, навукі і мастацтва.

Аддзяленне ТСБД сумесна з рэдкалегіяй газеты «Беларускі універсітэт» падрыхтавала спецыяльную старонку. Яна была прысвечана поспехам Балгарыі ў развіцці культуры.

Шырока была адзначана ва універсітэце таксама 26-я гадавіна сацыялістычнай рэвалюцыі. Былі прачытаны даклады, адбыліся гутаркі аб знамянальнай падзеі ў гісторыі балгарскага народа, яго дасягненнях у будаўніцтве сацыялістычнага грамадства. Многія студэнты і супрацоўнікі пазнаёміліся з вялікай фотавыстаўкай, прысвечанай юбілейнай даце. Члены нашага аддзялення выступілі з лекцыямі аб Балгарыі перад працоўнымі горада і рэспублікі.

Па ініцыятыве аддзялення ТСБД быў наладжан кантакт паміж грамадскімі арганізацыямі Беларускага і Сафійскага універсітэтаў.

Традыцыі паўнакроўнай дружбы ўзбагачаюцца і мацнеюць.

Д. МЕЛЬЦАР,
намеснік старшыні аддзялення Таварыства савецка-балгарскай дружбы, дацэнт.

КНІГІ-ПАДАРОЖНІЦЫ

Сектар замежнай літаратуры бібліятэкі Белдзяржуніверсітэта падтрымлівае сувязі з 36-ю установамі краін сацыялізма. У асноўным гэта акадэміі навук, універсітэты, педінстытуты Балгарыі, Венгрыі, ГДР, Польшчы, Румыніі і іншых краін.

Сафійскі універсітэт — адзін з актыўнейшых нашых напарнікаў. На працягу многіх год ён прысылае нам «Годишник на Софийские университет». Самы разнастайны матэрыял можа знайсці чытач на старонках гэтага зборніка. Выходзіць ён наступнымі серыямі: філасофска-гістарычная, ідэалагічная, матэматыкі, заходняй філалогіі, славянскай філалогіі, фізікі, біялогіі, хіміі, юрыдычных навук і інш.

За час з 1965 па 1970 гг. з Сафійскага універсітэта атрымана 116 нумароў гэтага зборніка і шэраг іншых навуковых выданняў.

У сваю чаргу наша бібліятэка паслала Сафійскаму універсітэту (за гэты ж час) 220 экземпляраў выданняў Белдзяржуніверсітэта. Толькі на працягу мінулага года бібліятэка універсітэта накіравала балгарскім сябрам 89 экземпляраў кніг, у тым ліку чатыры серыі «Веснік БДУ», падручнікі і кнігі па грамадска-палітычных пытаннях, спектраскапіі, дыферанцыяльных ураўненнях і іншыя.

З. ШАЛУПЕНКА,
ст. бібліёграф.

ПРЫЗНАННІ ШЧЫРЫЯ, САРДЭЧНЫЯ

Люба Іванава і Юлія Хрыстава прыехалі да нас з братняй Балгарыі. Займаюцца яны на факультэце прыкладной матэматыкі. Мы папрасілі дзяўчат падзяліцца сваімі ўражаннямі аб жыцці і вучобе ў нашай краіне.

НА ЗДЫМКУ: Л. ІВАНАВА (злева) і Ю. ХРЫСТАВА.

Тое, што я нарадзілася ў сонечнай Балгарыі, здаецца самым галоўным у маім не такім ужо доўгім 22-гадовым жыцці. Мяне хвалявала гэта, напэўна, заўсёды, але толькі два гады таму назад я ўсвядоміла поўнасцю такія паняцці, як Радзіма, народ, сябры. І гэта здарылася так нечакана, калі я прыняла такое сур'ёзнае рашэнне — паехаць вучыцца далёка. Гэта было звязана з маёй дзіцячай марай, якая і цяпер не змянілася — вывучаць матэматыку.

Пасля заканчэння школы я паступіла ў Сафійскі універсітэт на матэматычны факультэт. Вучылася там два гады. Магчымасць працягваць вучобу за мяжой, у СССР, была прадастаўлена жадаючым, якія займаліся выдатна. Усё было далёкім і незразумелым, але здзейснілася.

Мінск, Беларусь я не выбірала, але цяперашняе прызнанне, што не шкадую, будзе шчырым і сардэчным.

Я ўжо на III курсе факультэта прыкладной матэматыкі, займаюся ў І групе. І ўсё яшчэ патрэбна цярпенне і многа, многа ведаў, каб, стоячы перад гэтымі вялікімі машынамі, адчуць, што давядзеш усё да канца. Пачуццё, што трэба працаваць, падмацоўвае жаданне пазнаваць сёння і заўтра нешта новае.

А па-за універсітэтам, там, дзе ўжо няма формул і задач, пачынаецца тое звычайнае і складанае, дзіўнае і цікавае. Спачатку іншая мова, і хоць яна наша, славянская, але трэба імкнуцца да ўдасканалення, каб зусім знікла пытанне: «Які ў вас акцэнт?»

Кнігі, тэатр, кіно, прыемныя вечары з новымі беларускімі сябрамі кожны раз прыносяць нешта новае. Увесь час, кожную мінуту адкрываеш тое агульнае паміж усімі людзьмі і тое, аб чым не ведала, не думала. І ўсюды цеплыня, уважлівасць, добрыя адносіны, жаданне зрабіць прыемнымі твае ўспаміны аб гэтай вялікай краіне, аб савецкіх людзях, водгукі аб якіх ты чуў там, у сябе на Радзіме, яшчэ з дзяцінства. І дзіўна, што сціхлі першыя хваляванні і страх, што будзе цяжка, і здаецца, пачынаеш жыць у сваім другім доме, на сваёй другой Радзіме, гаварыць на сваёй другой роднай мове.

І ўсім добрым людзям хочацца падзякаваць ад ўсёй душы і падарыць многа сонца і розы з Балгарыі.

Люба ІВАНАВА.

Як трапіла ў Савецкі Саюз?

Я даўно любіла матэматыку і марыла, каб яна стала маім лёсам. У Сафіі я закончыла Нацыянальную матэматычную гімназію, пасля паступіла на матэматычны факультэт Сафійскага універсітэта. У нашым універсітэце вылічальная матэматыка лічыцца маладой спецыяльнасцю. Вось чаму пасылаюць часам некалькі студэнтаў за мяжу. Выбіраюць іх па поспехах сярод жадаючых вучыцца ў СССР або ў іншай краіне. Так і мяне паслалі. Зараз я займаюся на II курсе.

Хоць я заўсёды любіла самае абстрактнае ў матэматыцы, але за гэты час, што я правучылася ў Беларускім універсітэце, паспела палюбіць і сваю будучую спецыяльнасць. У нас цяпер арганізаваліся гурткі па праграміраванню і аптымізацыі, якія я наведваю з цікавасцю.

З рускай мовай у нас ужо няма ніякіх цяжкасцей. Яны, вядома, былі, але калі мы ўжо і думаем па-руску або ўстаўляем рускія словы ў балгарскую мову, то гэта азначае, што руская мова становіцца для нас другой роднай мовай.

Першыя ўражанні ад новых абставін, новай краіны ўжо ззаду. Ды і на самай справе людзі, жыццё ў нашых краінах ненамнога адрозніваюцца. Я не адчуваю, што жыву ў іншай краіне. Вядома, часта сумую без сваёй роднай Сафіі, без старых сяброў. Часам бываюць цяжкасці. У 20 год не так яшчэ лёгка рашаць усе складаныя пытанні самім, без бацькоў. Але магу сказаць, што дома, на канікулах, бываюць моманты, калі я думаю: «А што цяпер у Мінску? Як там мае сябры?»

Сафія, Мінск — кожны з гэтых гарадоў цяпер мае для мяне зачараванне нечага блізкага.

Юлія ХРЫСТАВА.

ВЯСНА І ЯЕ КЛОПАТЫ

Вось ужо больш як два тыдні каляндарныя лісткі вядуць нас па вясеннямy месяцу, але лютаўскія халады не парастаюць напамінаць аб сабе. І ўсё ж ідзе вясна, а з ёй і вясеннія клопаты. У гаспадарцы універсітэта гэта, у першую чаргу, работы па добраўпарадкаванню.

На днях наш карэспандэнт сустрэўся з прарэктарам універсітэта па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы Іванам Афанасьевічам Ажыгіным і папрасіў адказаць на некалькі пытанняў.

— Як заўсёды, з прыходам вясны ва універсітэцкім гарадку пачынаюцца работы па добраўпарадкаванню. У гэтым годзе іх намечана закончыць да юбілею універсітэта. Раскажыце, калі ласка, якія работы ўжо вядуцца і што неабходна зрабіць?

— У першую чаргу аб рамонце вучэбных карпусоў. У гэтым годзе участкі работы размеркаваны так, каб не распыляць рамонтнікаў па аб'ектах. Цяпер ужо закончаны работы ў вучэбным корпусе філалагічнага факультэта.

У актавай зале замянілі паркет, завезлі новую мэблю, пераабсталявалі свяцільнікі. У калідорах афарбаваны панелі.

У калідорах геаграфічнага корпуса стары паркет замяняецца мазаічнай плітой. Санвузлы абліцаваны кафельнай пліткай. Ідзе замена плафонаў на свяцільнікі дзённага асвятлення. Аналагічныя работы будуць праведзены ва ўсіх вучэбных карпусах.

— Што будзе зроблена па добраўпарадкаванню тэрыторыі універсітэцкага гарадка?

— Неабходна шмат зрабіць па азеляненню тэрыторыі. Як толькі сыйдзе снег, правядзем абрэзку дрэў і кустоў. У некаторых месцах давядзецца зрабіць падсадку. Ёсць, на жаль, студэнты, якія замест таго, каб хадзіць па дарожках, аддаюць перавагу непратоптаным сцежкам, і маладыя насаджэнні для іх не перашкода.

У красавіку мы намячаем правесці ленінскі нядзельнік, у час якога пастараемся прывесці ў парадак тэрыторыю за геаграфічным і юрыдычным карпусамі з боку прывакзальнай плошчы. Адтуль трэба вывезці будаўнічае смецце. Поўнасцю ачысцім гэту пляцоўку, пасадзім дрэвы і кусты, разаб'ём клумбы. З боку плошчы гарадок абнясем сетачнай агарожай. Калі будзе выдзелена неабходная сума грошай, заасфальтуем дарогу ад уезда, пляцоўкі і сцежкі.

Вось гэта асноўнае, што намечана планам гаспадарчых работ да 50-годдзя універсітэта.

— Іван Афанасьевіч, ці будуць весціся работы па добраўпарадкаванню інтэрнатаў?

— Зараз закончан рамонт інтэрната № 6 па вуліцы Кастрычніцкай. Там абсталяваны бытавыя пакоі. Праведзена пабелка і фарбоўка. Усюды заменены плафоны на сучасныя свяцільнікі.

Падобнае будзе зроблена ў інтэрнаце па вуліцы Свярдлова. У інтэрнаце № 4 па Паркавай магістралі асноўныя рамонтныя работы зроблены яшчэ ў мінулым годзе. Там мы намячаем асвяжаючую афарбоўку на першым паверсе, наколькі будзе можна, пераабсталюем памяшканне буфета.

ПРЫСВЕЧАНА

СЛАЎНАЙ ГАДАВІНЕ

Увагу наведвальнікаў бібліятэкі галоўнага корпуса прыцягвае выстаўка «Прадвесніца новага міру». Яна прысвечана 100-годдзю Парыжскай Камуны.

На кніжных паліцах размешчаны творы К. Маркса і Ф. Энгельса «Прывітанне французскім рабочым з выпадку 21-й гадавіны Парыжскай Камуны», «Рэзалюцыя мітынгу ў гонар гадавіны Парыжскай Камуны», праца К. Маркса «Грамадзянская вайна ў Францыі», якая раскрывае сапраўдны сэнс гэтай важнай падзеі.

Прадстаўлены на выстаўцы артыкулы У. І. Леніна «Урокі Камуны», «Дзяржава і рэвалюцыя», «Памяці Камуны». Ёсць тут шмат кніг з цыклу «Жыццё выдатных людзей». Сярод іх — Г. Нікалаевай «Маркс і Энгельс», В. Дзьякава «Яраслаў Дамброўскі», В. Абрамовічуса і В. Дзьякава «Валерый Урублеўскі» і іншыя. Ярка адлюстроўваюць падзеі 1871 года і творы мастацкай літаратуры: Луізы Мішэль «Камуна», Жуля Валеса «Инсургент», В. Паўленкі «Барыкады», песні, вершы, пазмы Эжэна Пацье.

М. МАЦЕЙКА.

УШАНАВАННЕ КАНДРАТА КРАПІВЫ

12 сакавіка на філалагічным факультэце адбылося сумеснае пасяджэнне кафедр беларускай літаратуры і мовы, прысвечанае 75-годдзю з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі Кандрата Крапівы.

У актавай зале філфака сабраліся выкладчыкі, студэнты аддзялення беларускай і рускай мовы і літаратуры. Пасяджэнне адкрыў кароткім уступным словам прафесар М. Р. Ларчанка. Затым пра жыццёвы і творчы шлях юбіляра расказаў дацэнт Д. Я. Бугаёў, аўтар даследавання творчасці К. Крапівы, якое толькі што выйшла з друку. Дакладчык засяродзіў увагу на тым вялікім укладзе, які ўнёс выдатны сатырык у беларускую савецкую і ўсесаюзную літаратуру і культуру. Кандыдат філалагічных навук В. П. Красней спыніўся на характарыстыцы мовазнаўчых прац пісьменніка.

Урачыстае пасяджэнне закончылася невялікай мастацкай часткай. У выкананні студэнтаў З. Стукан, С. Крэпскага, Т. Сянчылы, В. Кабылянскай, А. Бутэвіча, Т. Краўчанка прысутныя пачулі сатырычныя вершы і байкі К. Крапівы.

В. КАЧАНОВІЧ.

У канцы лютага праходзіла асабіста-камандное першынство БДУ па класічнай барацьбе ў праграме круглагадавой спартакіяды. Нягледзячы на тое, што ў спаборніцтвах удзельнічалі наманды ўсяго сямі факультэтаў, паядынкі праходзілі напружана і цікава. 80 барцоў змагаліся ў спартыўнай зале юрыдычнага факультэта.

Не памылюся, калі скажу, што самую вялікую колькасць балельшчыкаў прыцягнула «міжнародная», як яе назвалі, схватка паміж Нгуен Нгок Куэ (матфак) і Іванам Сцяпурам (журфак). Але няроўнымі былі сілы і майстэрства сапернікаў: больш вопытны студэнт з далёкага В'етнама дабіўся перамогі.

Пацвердзіў званне мацнейшага і студэнт I курса факультэта прыкладной матэматыкі А. Канаў. Нядаўна ён заняў другое месца ў Новасібірску на першынстве ЦС «Буравеснік» сярод юніёраў у вазе да 48 кг.

ЧЭМПІЁНЫ ВЫЗНАЧЫЛІСЯ

Чэмпіёнамі спаборніцтваў сталі ў парадку вагавых катэгорый наступныя барцы:

да 52 кг—Нгуен Нгок Куэ (матфак)

да 57 кг—Ф. Вабішэвіч (геафак)

да 62 кг—Ю. Якаўлеў (фізфак)

да 68 кг—С. Працко (фізфак)

да 74 кг—Ф. Валькавіч (геафак)

да 82 кг—Э. Шпігельман (матфак)

да 90 кг—В. Ашуйка (матфак)

да 100 кг—А. Мяшкарудны (фізфак)

Тры першыя месцы занялі каманды фізічнага, хімічнага і геаграфічнага факультэтаў.

С. УЛАДЗІМІРАЎ.

ДАРОГАМІ ДРУЖБЫ

На гэты раз агітбрыгада факультэта журналістыкі стала госцяй Матароўскай сярэдняй школы Пухавіцкага раёна. Студэнты расказалі аб вучобе ва універсітэце, падарылі школьнікам бібліятэчку. А пасля быў канцэрт. І доўга гучалі ў перапоўненай школьнай зале студэнцкія песні, вершы Ясеніна, Маякоўскага, Джаліля... На кожны нумар слухачы адклікаліся шчырымі апладысментамі.

НА ЗДЫМКАХ: перад слухачамі - школьнікамі (злева направа) С. Рамаческу, М. Кузняцоў і В. Дзяткоў.

В. ЖУК.

ШТАБ ПРАЦОЎНЫХ СПРАЎ ПАВЕДАМЛЯЕ

Усім байцам СБА універсітэта неабходна прайсці медыцынскі агляд у медпункце БДУ з 10.00 да 17.00 у наступныя дні:

I ЭТАП — з 22 сакавіка па 5 красавіка (150—170 чалавек штодзённа).

Гістфак — 22 сакавіка
Юрфак — 23 сакавіка
Філфак, хімфак — 24—25 сакавіка
26—27 сакавіка — гістфак, юрфак, хімфак, філфак павінны закончыць медагляд.
Матфак — 29—30 сакавіка
ФПМ — 31 сакавіка — 1 красавіка
Фізфак — 2, 3, 5 красавіка.

II ЭТАП

Гістфак — 26 красавіка
Юрфак — 27 красавіка
Філфак, хімфак — 29—30 красавіка
Матфак — 3—4 мая
ФПМ — 5—6 мая
Фізфак — 7, 8, 10, 11 мая

III ЭТАП

Гістфак — 26—27 мая
Юрфак — 28—29 мая
Філфак, хімфак — 31 мая, 1, 2 чэрвеня
Матфак — 3—5 чэрвеня
ФПМ — 7—9 чэрвеня
Фізфак — 10—12, 14 чэрвеня.

Сакратары камітэтаў камсамола, начальнікі штабаў факультэтаў і камандзіры лінейных атрадаў павінны асабіста кантраляваць парадак і тэрміны праходжання медагляду байцамі атрадаў.

ЭКЗАМЕНАЦЫЙНЫЯ ДЫЯЛОГІ

— Які ў вас білет?
— Э... э... э... Цяжкі.

* * *

Студэнтка: — Ну, нарэшце здала.

Выкладчык: — Гэта я здаўся.

* * *

Выкладчык: — Што вы можаце сказаць пра Н'ютана?

Студэнт: — Нічога, акрамя добрага.

* * *

Экзаменатар (разгневана): — У вашай галаве няма ні адной думкі! Сапраўдная пустыня!

Студэнт: — У кожнай пустыні ёсць аазісы, але не кожны караван іх знаходзіць...

* * *

Студэнт (хныкае):—Прафесар, я не заслугоўваю двойкі...

— Ведаю, але, на жаль, больш нізкіх адзнак у нас няма.

* * *

Прафесар: — Экзамен— гэта, як тэатр: вы акцёр, я глядач.

Студэнт: — Выдатна! Зараз паклічу суфлёра!

Рэдактар
А. А. НІКОЛЕНКА

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, гапоўны корпус, п. 106. Тэлефон—22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
АТ 09628. Зак. 361. Тыраж 2.000 экз.